# ЭМАЦЫЯНАЛЬНЫ СВЕТ ТВОРЦЫ
# (НА ПРЫКЛАДЗЕ АПОВЕСЦІ-ЭСЭ В. КАРАМАЗАВА
# “КРЫЖ НА ЗЯМЛІ І ПОЎНЯ Ў НЕБЕ”)

***Каўшар В. Р.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– Т. С. Нуждзіна канд. філал. навук, дацэнт*

Першым творам, які засведчыў пачатак новага этапу ў эсэістыцы В. Карамазава, стала аповесць-эсэ “Крыж на зямлі і поўня ў небе” (1991), прысвечаная *“жыццю жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі”*.

Пісьменнік знаёміць нас са слынным беларускім мастаком, для якога сапраўдным шчасцем было творча працаваць, спасцігаць таямніцы прыроды і чалавечага існавання, каб потым выявіць іх на сваіх жывапісных палотнах і ва ўласных мастацкіх тэкстах.

Асаблівае значэнне В. Карамазаў надае спасціжэнню эмацыянальнага свету майстра. Ён таленавіта перадае мастацкія пошукі Бірулі, яго жаданне наблізіцца да гучання патаемнага, адвечнага ў прыродзе: *“Ён дзень пры дні шукаў на палітры і палатне патрэбны тон. Натхненне лавіў на ўзыходзе сонца, калі першае святло зрывала з азёрнага люстра белую начную коўдру, падсіненую ўльтрамарынавым золакам, разводзіла на вадзе вохрыста-бірузовую паводку, шукаў і пазней, калі выспяваў, наліваўся на сонцы дзень, святло якога было спакайнейшым і больш трывалым за ранішняе”* [1, с. 4]. Мастак валодаў надзвычайным “слыхам”, які ў свой час адзначыў сам Ісак Левітан, настаўнік і кумір Бялыніцкага-Бірулі. Гэтая здольнаць дазваляла жывапісцу знайсці непаўторны міг у прыродзе і напоўніць яго выразным пачуццём, колерам і гукам, у выніку чаго ён ствараў карціны на памежжы жывапісу і музыкі. У сваю чаргу, музыка натхняла яго на новыя мастацкія адкрыцці, дапамагала паглыбіцца ва ўласныя пачуцці, каб потым шчыра перадаць іх на сваіх палотнах. Гэтак сталася, калі спрабаваў напісаць партрэт каханай дзяўчыны. Тады гучала меса Грыга: *“Кінуўся ў пакой да палітры. Спяшаўся. Баяўся, каб не пагасла фасфарычная гама ночы, яе нечаканае ззянне, якое якраз і было жаданым святлом,*



МГПУ им. И.П.Шамякина

*каб не змоўкла меса”* [1, с. 6]. Ён хацеў, каб на яго палотнах гучала яго любімая музыка. І яе сапраўды можна пачуць, звярнуўшыся да цыклу пейзажаў, прысвечаных выдатнаму кампазітару: “Дом Чайкоўскага”, “Ціхая светлая ноч”, “Вечар юнага мая”, “Алея саду Чайкоўскага”.

На старонках аповесці-эсэ паўстае аблічча яркай і глыбокай асобы, гарманічны вобраз Чалавека, Жывапісца, Пяляўнічага і нават Паэта, які здольны ўспрымаць і выяўляць музыку гукаў, фарбаў і слоў.

**Літаратура**

1. Карамазаў, В. Крыж на зямлі і поўня ў небе: эскізы, эцюды і споведзь Духу, альбо Аповесць-эсэ жыцця жывапісца і паляўнічага Бялыніцкага-Бірулі / В. Карамазаў. – Мінск: БелЭн. імя П. Броўкі, 2010. – 216 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина